# Лепшыя вызначаны



Конкурс на лепшую групу універсітэта "Груп-шоу 2008".

БДУ культуры і мастацтваў заўсёды здзіўляе сваіх студэнтаў, а таксама студэнтаў з іншых навучальных устаноў, насычанасцю культурнай праграмы і разнастайнасцю тых мерапрыемстваў, якія штогод праводзяцца ў нашай Alma Mater. Кожны год ва універсітэце з'яўляецца вялікая колькасць новых сацыякультурных праектаў. Гэты год не стаў выключэннем. Разам з іншымі праектамі ў гэтым годзе стартаваў конкурс на лепшую групу універсітэта. І, нягледзячы на тое, што конкурс праводзіўся ўпершыню, ён атрымаўся надзвычай цікавы і захапляльны і быў праведзены на высокім узроўні.

На працягу конкурса паміж групамі-ўдзельніцамі склаліся сяброўскія і , разам з тым, спаборніцкія адносіны. І гэта не дзіўна, бо ганаровае званне "Лепшая група універсітэта" магла атрымаць толькі адна з чатырох камандаў груп 137, 210, 215, 237.

Кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурса ажыццявіў студэнцкі савет універсітэта, які і стварыў аргкамітэт. Сваімі мэтамі ён ставіў стымуляванне пазнавальнай, творчай і сацыяльнай актыўнасці студэнтаў у працэсе навучання, іх з'яднанне ў акадэмічнай групе.



Конкурс праходзіў у тры этапы: завочны, спартыўны і творчы.

Каб трапіць у рады першапраходцаў трэба было падаць заяўку на ўдзел, падлічыць сярэдні бал групы за апошнюю сесію. Таксама ўлічваліся ўсе ўзнагароды групы атрыманыя пад час навучання.

У першым туры каманды павінны былі зрабіць плакатывізіткі і відэа-прэзентацыі сваіх груп. Усё гэта мы маглі пабачыць на першым і другім паверхах універсітэта на працягу тыдня.

Другі тур-спартыўны, праходзіў у Лошыцкім парку 24 красавіка. Тут журы змагло выявіць спартыўную падрыхтоўку і фізічныя здольнасці студэнтаў, а таксама ўменне работаць у камадзе, згуртаванасць груп.

Фінал конкурса праходзіў у гэты ж дзень у 114 аўдыторыі. У склад журы ўвайшлі выкладчыкі і старшыні розных студэнцкіх арганізацый: Наважылава Ганна, Ракоўская Алена, Буглак Вольга, Андрэеў Сяргей, Каляда Уладзімір. Узначаліла журы начальнік аддзела выхаваўчай работы з моладдзю Людміла Манакова. Вядучым фінальнага спаборніцтва стаў Зубкоў Раман. Камандам-удзельніцам прапанавалася праявіць свой інтэлектуальны ўзровень і творчы патэнцыял. Фінальны тур праходзіў у тры раунды. У першым раундзе каманды прадставілі падрыхтаваныя візіткі, у якіх паспрабавалі расказаць пра сябе і неяк запомніцца. Так, напрыклад, каманда "На біс" (237 група) нават распрацавала свой герб у выглядзе Нацыянальнай бібліятэкі. Другі раунд выяўляў камандны дух і згуртаванасць. Групы праспявалі караоке, гэта былі ўсім добра вядомыя песні з савецкіх фільмаў. А потым паспрабавалі адказаць на каверзныя пытанні выкладчыкаў. Апошні раунд – дамашняе заданне на патрыятычную тэму.

Напрыканцы вечара, калі журы адправілася вырашаць, хто лепшы, адбыўся конкурс заўзятараў. Перамогу ў ім атрымалі заўзятары 215 групы.

Трэба адзначыць, што спонсарам дадзенага мерапрыемства з'ўлялася кампанія "Онега".

Барацьба за права называцца "Лепшай групай" уніврсітэта была вельмі напружанай на працягу ўсяго конкурса. Але ж намінацыі размеркаваліся наступным чынам:

"Сябар-група 2008"- 237 група ФІДК;

"Спорт-група 2008"-137гр. ФІДК;

"Крэатыў-група 2008"-215 гр. ФІДК.

І перамажцам конкурса стала 210 група ФКіСКД. Пераможцы былі ўзнагароджаны пераходзячым кубкам і сертыфікатам на надбаўку да стыпендыі ў памеры 50%. Астатнія групы былі ўзнагароджаны дыпломамі ды каштоўнымі падарункамі.

**Алена Цэрлюк**